ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
17
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 37 (1337)
Выходзіць раз у тыдзень

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### КАНФЕРЭНЦЫІ ЧЫТАЧОЎ

**па новаму твору Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева «Успаміны» прайшлі на біялагічным факультэце і факультэце журналістыкі.**

**В. ЖДАНКО.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

### АГУЛЬНЫ СХОД

**слухачоў падрыхтоўчага аддзялення адкрыў яго загадчык, дацэнт А. Г. Слука. Ён павіншаваў прысутных з пачаткам заняткаў, расказаў аб традыцыях аддзялення. У сваіх выступленнях прадстаўнікі камітэта камсамола і прафкома універсітэта расказалі аб грамадскай рабоце, самадзейнасці і спартыўным жыцці студэнтаў. Потым адбыліся выбары камсамольскага і прафсаюзнага бюро, рэдкалегіі падрыхтоўчага аддзялення.**

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення.**

### З ВЯЛІКІМ ПОСПЕХАМ

**выступілі студэнты БДУ на вечары, прысвечаным Дню балгарскага студэнта ў актавай зале політэхнічнага інстытута. Нашы філолагі віталі балгарскіх сяброў на іх роднай мове. У канцы праграмы прагучала самадзейная песня, аўтарамі якой з'яўляюцца другакурснік беларускага аддзялення філфака А. Шырын і трэцякурснік рускага аддзялення У. Карташоў.**

**І. ПАГАСЯН,**
**студэнтка філфака.**

### ПРАЙШЛО НЕКАЛЬКІ

**заняткаў студэнцкага навукова-даследчага гуртка «Сусвет». На пасяджэнні гуртка, якое адбудзецца 23 снежня 1981 года, пойдзе гаворка аб загадкавых і здзіўляючых аб'ектах Сусвету — чорных дзірках. Па данай тэме будуць паказаны слайды.**

**А. РУБАНАЎ,**
**старшыня НСС універсітэта,**
**А. ТРАФІМЕНКА,**
**кіраўнік гуртка.**

### ПЕРАМОЖЦАМІ

**ў сацыялістычным спаборніцтве за кастрычнік — лістапад прызнаны прафсаюзныя арганізацыі ФПМ, мехмата, юрыдычнага, геаграфічнага факультэтаў. Слабей працавалі ў гэты перыяд радыёфізікі, філолагі, фізікі. Трэба адзначыць, што прафсаюзная арганізацыя радыёфізічнага факультэта, якая заўсёды лічылася адной з лепшых, зараз займае апошняе месца.**

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

● **ФОТАВЫСТАЎКА**

## 60-годдзю універсітэта прысвячаецца

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі адкрылася фотавыстаўка работ студэнта Аляксандра Раўбы. Выстаўку Аляксандр прысвяціў 60-годдзю ўтварэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Асаблівую цікавасць выклікаюць здымкі герояў Вялікай Айчыннай вайны: «Паважаны грамадзянін горада Слуцка», «Ветэран», «Расказ ветэрана»...

Надоўга затрымліваюцца прысутныя, гледзячы на фота дзяцей: «Чапаёнак», «Гаспадар», «Каля старога хлява», «Апошнія навіны». Ёсць шмат каляровых здымкаў аб прыродзе нашай роднай Беларусі.

**Б. САЧАНКА,**
**студэнт журфака.**

## Сардэчна віншуем!

**Абаранілі кандыдацкія дысертацыі:**

**АЛЕНА ІВАНАЎНА ШЫЛКІНА** — факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра метадаў аптымальнага кіравання (навуковы кіраўнік прафесар **Р. Ф. Габасаў**)

**МІХАІЛ МІХАЙЛАВІЧ ФЯДЭНЯ** — факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра вышэйшай матэматыкі (навуковы кіраўнік прафесар **Ю. С. Багданаў**)

**ВІКТАР МІКАЛАЕВІЧ ГАРБУЗАЎ** — механіка-матэматычны факультэт, кафедра дыферэнцыяльных ураўненняў (навуковы кіраўнік прафесар **М. А. Лукашэвіч**)

**АЛЯКСАНДР ЯКАЎЛЕВІЧ КРУГЕР** — факультэт прыкладной матэматыкі, кафедра метадаў аптымальнага кіравання (навуковы кіраўнік прафесар **Р. Ф. Габасаў**)

**АЛЯКСАНДР БЕНЦЫЯНАВІЧ КАГАНАЎ** — вылічальны цэнтр (навуковы кіраўнік доктар педагагічных навук **Р. І. Хмялюк**).

**Жадаем далейшага творчага натхнення, новых пошукаў і цікавых знаходак!**



## АПОШНІЯ ДНІ СЕМЕСТРА

**Прывітаўшыся са шматлікай аўдыторыяй, прафесар кафедры агульнага землязнаўства В. М. Шырокаў задае пытанне:**

**— На чым жа мы закончылі папярэднюю размову! Вось вы, калі ласка...**

**Задаволены адказам, прафесар пачынае лекцыю. Агульная гідралогія — складаная навука, мае вялікае значэнне для развіцця многіх галін народнай гаспадаркі. Прафесар задае пытанні студэнтам, правяраючы, як засвоілі яны папярэдні матэрыял, як разумеюць тую ці іншую думку лекцыі. Вячаслава Міхайлавіча зразумець проста: гэта апошнія лекцыі перад сесіяй, ён зацікаўлены ў высокім узроўні ведаў студэнтаў. Просіць задаваць пытанні, дае тлумачэнні.**

**Закончылася лекцыя. Другакурснікі геафака пакідаюць аўдыторыю, накіроўваюцца ў чытальныя залы, лабараторыі. Ідзе падрыхтоўка да сесіі.**

**В. ШАЧАК.**



● **КОНКУРС**

## ТВОРЧАСЦЬ ЖУРНАЛІСТА

КОНКУРС студэнтаў журфака пад дэвізам «Лепшая публікацыя, радыё- або тэлеперадача года» падыходзіць да фінішу. Ён праводзіцца дэканатам факультэта журналістыкі, пярвічнай журналісцкай арганізацыяй Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і праўленнем Саюза журналістаў БССР з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў і вызначэння сярод іх найбольш таленавітых будучых творчых супрацоўнікаў газет, радыё і тэлебачання.

Для пераможцаў устаноўлена шэсць грашовых прэмій.

**К. БУЛЫЧОВА,**
**студэнтка журфака.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні**
**тав. АЛЕКСАНДРОВІЧА С. Х. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

За плённую навукова-педагагічную і літаратурную работу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўзнагародзіць прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна тав. **Александровіча** Сцяпана Хусейнавіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**І. ПАЛЯКОЎ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Л. ЧАГІНА.**

14 снежня 1981 года.
г. Мінск.

## УПІШАМ НОВЫ РАДОК У ЛЕТАПІС СЛАЎНЫХ СПРАЎ!

● ПАМЯЦІ ПАЭТА

# ЗЗЯЕ «ЗОРКА ВЕНЕРА»

НА ВЕЧАРЫ, прысвечаным 90-годдзю беларускага паэта М. Багдановіча, што адбыўся на філфаку, прысутнічала, акрамя студэнтаў і выкладчыкаў факультэта, шмат гасцей, сярод якіх вядомы паэт і перакладчык твораў М. Багдановіча на рускую мову А. Я. Параховіч з Горкага, старшыня Львоўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Украіны паэт Раман Лубніўскі, загадчык кафедры беларускай мовы Варшаўскага універсітэта прафесар і паэт Алесь Барскі і іншыя.

Адкрываючы вечар, загадчыца кафедры беларускай літаратуры дацэнт В. В. Казлова падкрэсліла значэнне паэзіі М. Багдановіча для ўсіх славянскіх літаратур.

Госці выступалі з уласнымі вершамі, прысвечанымі юбіляру, чыталі пераклады яго твораў на розныя мовы.

Заслужаны дзеяч культуры БССР, кампазітар Ю. Семяняка расказаў аб сваёй працы над операй «Зорка Венера».

Урачыстую частку вечара змяніла мастацкая, якую цалкам падрыхтавалі два самабытныя студэнцкія калектывы: «Беларуская спеўная майстроўня» і «Беларуская драматычная майстроўня». Кампазіцыя пачалася арыгінальным пралогам доктара філалагічных навук, прафесара, вядомага паэта Алега Лойкі. Потым гучалі беларускія народныя песні, вершы паэта.

**Н. БАРЫСЕНКА,**
**студэнтка журфака.**



На здымках В. ШАЧАКА — імгненні вечара.




● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

# У НАГУ З ЧАСАМ

**АТЛЕТЫЧНАГА СКЛАДУ ПОСТАЦЬ, АДКРЫТЫ ТВАР, УВАЖЛІВЫ, ДОБРАЗЫЧЛІВЫ ПОГЛЯД — ТАКІЯ ЗНЕШНІЯ РЫСЫ ПРАФЕСАРА. НА РАБОЧЫМ СТАЛЕ — КНІГІ, НАЗВЫ ЯКІХ НАМ, БОЛЬШ ЛІРЫКАМ, ЧЫМ ФІЗІКАМ, ЗУСІМ МАЛА АБ ЧЫМ ГАВОРАЦЬ, ТЭЛЕФОНЫ З РАЗУМНЫМІ КНОПКАМІ.**

**МЫ ЗНАХОДЗІМСЯ Ў КАБІНЕЦЕ ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ ЯДЗЕРНАЙ ФІЗІКІ ПРАФЕСАРА, ДОКТАРА ТЭХНІЧНЫХ НАВУК С. С. ШУШКЕВІЧА. СТАНІСЛАЎ СТАНІСЛАВАВІЧ РАСКАЗВАЕ ПРА СВАЁ ПОЎНАЕ ДРАМАТЫЗМУ ПАСТУПЛЕННЕ НА ТАГАЧАСНЫ ФІЗМАТ. ПАСЛЯ ЗАКАНЧЭННЯ ВУЧОБЫ БЫЛА АСПІРАНТУРА Ў ІНСТЫТУЦЕ ФІЗІКІ АН БССР, ЗАТЫМ ГОД РАБОТЫ НА АБ'ЯДНАННІ «ГАРЫЗОНТ». З УНІВЕРСІТЭТАМ СВОЙ ЛЁС КАНЧАТКОВА ЗВЯЗАЎ МАЛАДЫ ВУЧОНЫ Ў 1961 ГОДЗЕ. КАНДЫДАЦКАЯ, АБАРОНА ДОКТАРСКАЙ ДЫСЕРТАЦЫІ... ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ НАЗАД СТАНІСЛАЎ СТАНІСЛАВАВІЧ СТАЎ ЗАГАДЧЫКАМ КАФЕДРЫ. ЁН РАСКАЗВАЕ:**

— Цяпер на кафедры працуе звыш ста чалавек, існуюць тры напрамкі ў рабоце навуковага калектыву. Праводзіцца эксперымент, звязаны з фундаментальным даследаваннем; працуем мы для патрэб народнай гаспадаркі. Заключаем дагаворы з прадпрыемствамі, навукова-даследчымі ўстановамі. Дастаткова сказаць, што эканамічны эфект нашай дзейнасці складае прыкладна 1 мільён рублёў за год, а за 1980 ён быў трохмільённы — гэты паказчык вышэй, чым у сярэднім па рэспубліцы.

У параўнанні з 50-мі гадамі на фізфаку адбыліся фантастычныя перамены. Тады факультэт адставаў у цэлым па краіне па ўсіх напрамках, акрамя тэарэтычнай фізікі; цяпер мы на саюзных і нават міжнародных канферэнцыях не выглядаем «правінцыяй».

**— Што б вы пажадалі сённяшнім студэнтам! Не абавязкова фізікам...**

— Думаю, не памылюся, калі скажу, што нашы студэнты — народ адукаваны і сур'ёзны: нездарма мы давяраем ім працаваць на апаратуры, кошт якой складае дзесяткі тысяч рублёў. Надзеі, якія мы ўскладаем на іх, яны ў пераважнай большасці апраўдваюць. Я пажадаў бы студэнтам не губляць ніводнай магчымасці, якія дае універсітэт: работа ў лабараторыях, наведванне лекцый, практычныя заняткі, сувязі з людзьмі навукі і ўстановамі Мінска.

**— У матэрыялах XXVI з'езда КПСС ёсць радкі, якія адрасаваны непасрэдна вам, людзям, якія распрацоўваюць праблемы сучаснай фізікі...**

— Партыя паставіла перад намі задачу — паскорыць прымяненне міні-машын і працэсаў па аўтаматызацыі навуковых даследаванняў. Такім чынам, гэтыя патрабаванні цалкам адпавядаюць тым распрацоўкам, якія вядуцца на кафедры ядзернай фізікі. Можна сказаць, што мы крочым у нагу з часам.

Планы на будучае? Іх шмат. Працаваць — нявырашаных задач хапае, многія праблемы паяўляюцца ў працэсе работы. Ёсць у нас запаветная мара: набыць здавальняючую вытворчую базу, а таксама аднавіць ранейшыя адносіны са станочнай базай: вытворчыя майстэрні патрэбны нам, як хлеб надзённы!

Мяне заўжды радавала тое, што я працую ва універсітэце. Для нашых навуковых даследаванняў ёсць магутны фундамент — тэарэтычная фізіка.

**...Слухаючы вучонага, я міжволі зрабіў нечаканы, аднак, думаецца, заканамерны вывад: не толькі Станіслаў Станіслававіч можа сімвалічна сказаць: «Дзякуй, БДУ!», але і універсітэту ёсць за што падзякаваць кафедры, якую ён узначальвае.**

**П. ЦУНІК.**

● РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

# ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

НА XXIX справаздачна-выбарнай канферэнцыі камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна байцы студэнцкіх атрадаў рапартавалі: школу СБА ў 1981 годзе прайшлі 2886 чалавек, імі асвоена каля 5 млн. рублёў капіталаўкладанняў, пабудавана каля 80 аб'ектаў, прачытана 1554 лекцыі, дадзена 837 канцэртаў.

Шырокая геаграфія дыслакацыі нашых студэнцкіх атрадаў — Малдаўская ССР і Стаўрапольскі край, Якуцкая і Карэльская АССР, Пскоўская вобласць і Алтайскі край, Казахская і Узбекская ССР, наша родная Беларусь.

Зводны СБА універсітэта заняў першае месца ў абласным аглядзе-конкурсе. Сёння мы ганарымся нашымі лепшымі атрадамі «Мінчане» (мехмат), імя А. Матросава (радыёфізічны), імя Гарыбальдзі (гістфак), «Спадчына» (юрфак), «Славія» (юрфак), імя Купрыянава (радыефізічны), «Стэлуца» (мехмат), якія дабіліся высокіх паказчыкаў па ўсіх напрамках работы. Пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва сярод зводных факультэцкіх атрадаў стаў СБА механіка-матэматычнага факультэта. Другое месца заняў юрыдычны факультэт, на трэцім — гістарычны.

Атрады — гэта школа жыцця для кожнага студэнта. І агульная задача камітэтаў камсамола, штабоў працоўных спраў факультэтаў—дабіцца найлепшай падрыхтоўкі атрадаў і выдатнай якасці іх работы.

**А. ЧУЛКОЎ,**
**начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.**

● У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

# АБУДЖАЦЬ ПРАГУ ВЫСОКАЙ ДУХОЎНАСЦІ

ВЫПУСКНІК УНІВЕРСІТЭТА павінен быць не толькі прафесійна кампетэнтным спецыялістам, але і чалавекам разнастайных інтарэсаў, камуністычнай перакананасці і агульнай высокай культуры.

У фарміраванні такога чалавека вялікая роля адводзіцца эстэтычнаму выхаванню, поспех якога залежыць ад таго, наколькі сістэматычна і мэтанакіравана яно ажыццяўляецца.

На філалагічным факультэце разнастайная работа па эстэтычнаму выхаванню праводзіцца ў адпаведнасці з пяцігадовым комплексным перспектыўным планам ідэйна-эстэтычнага выхавання студэнтаў. Такі план распрацаваны дэканатам, партыйным бюро філфака сумесна з факультэцкай камісіяй па ідэйна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў.

Згодна з планам для студэнтаў-філфакаўцаў прачытаны цыклы лекцый па палітыка-эканамічнай, эстэтычнай тэматыцы. На філфаку выступілі міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў БССР, прафесары Л. М. Бабосаў, А. А. Галаўко, артысты тэатра імя Я. Купалы, рускага тэатра імя М. Горкага, маладыя артысты аркестра Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, народны артыст СССР Я. А. Вашчак і іншыя.

Незабыўнымі былі для студэнтаў творчыя сустрэчы з вядомымі беларускімі літаратарамі І. Шамякіным, І. Навуменкам, В. Быкавым, А. Макаёнкам, Н. Гілевічам, А. Лойкам, С. Шушкевічам, Р. Барадуліным і іншымі, якія правяла кафедра беларускай літаратуры сумесна з камітэтам камсамола.

Надзвычай многа ў сэнсе эстэтычнага выхавання і прафесійнай падрыхтоўкі даюць студэнтам-філфакаўцам культпаходы ў тэатры з абмеркаваннем прагледжаных спектакляў. Тут удзячным словам неабходна ўспомніць дацэнта З. Б. Варановіч, якая ў арганізацыю такіх абмеркаванняў заўсёды ўносіць шмат цеплыні і энтузіязму.

Няспынная ўвага ўдзяляецца на філфаку развіццю творчых здольнасцей і талентаў студэнтаў. Ужо неаднаразова гаварылася пра плённую работу літаратурнага аб'яднання «Узлёт», якім кіруе вядомы паэт і вучоны, прафесар кафедры беларускай літаратуры А. А. Лойка. З філфакаўскага «Узлёту» ўзялі ўпэўнены старт у вялікую літаратуру шматлікія яго выхаванцы. Школу пазнання цудоўнага праходзяць студэнты і ў творчым гуртку тэорыі і крытыкі, якім кіруе вядомы даследчык беларускай літаратуры дацэнт В. П. Рагойша.

А хіба можна не сказаць пра вялікую ролю мастацкай самадзейнасці — масавай формы далучэння студэнтаў да свету цудоўнага. На філфаку ёй удзяляецца сур'ёзная ўвага.

Нельга не ўспомніць асобных выканаўцаў, якія сваім майстэрствам актыўна спрыяюць павышэнню эстэтычнай культуры студэнтаў, іх грамадскаму, палітычнаму выхаванню. Гэта лаўрэаты Усесаюзнага і Рэспубліканскага конкурсаў палітычнай песні А. Ацьман, А. Булыга, лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу палітычнай песні У. Васіленка, гэта А. Анкудзінава, вядучыя шматлікіх канцэртаў П. Навіцкі і Т. Ганчарова і многія іншыя студэнты.

Плён творчай працы, назапашаны эстэтычны вопыт студэнты-філфакаўцы шчыра аддаюць людзям. Яны неаднаразова выязджалі з канцэртамі ў падшэфную Мінскую школу № 80, у Хатлянскую школу. На фальклорнай і педагагічнай практыках, у час сельгасработ студэнты філфака заўсёды выступаюць з канцэртамі, з дакладамі, наладжваюць літаратурныя вечары і вечары паэзіі і песні.

Студэнцкая самадзейнасць філфака прыцягвае студэнтаў з іншых братніх рэспублік Савецкага Саюза, а таксама з замежных краін, якія навучаюцца ва універсітэце. Гэта спрыяе іх узаемнаму ўзбагачэнню, умацаванню інтэрнацыянальнай еднасці. Такая еднасць была прадэманстравана на вялікім свяце, якое адбылося ў Міжнародны дзень студэнтаў у кафэ «Алімпійскае» з удзелам студэнтаў і стажораў з ГДР. На вечары гучалі песні аб дружбе і адзінстве моладзі свету, аб міры і шчасці.

У філолагаў, удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, шмат творчых планаў, але на шляху іх здзяйснення нямала перашкод: вучоба ў тры змены, адсутнасць кваліфікаваных кіраўнікоў, вялікія цяжкасці з рэквізітам і інш. Але камсамольскі энтузіязм перамагае.

Увогуле камсамольская арганізацыя філфака на чале з сакратаром Таццянай Сотчанка — калектыў зладжаны, ініцыятыўны. Камітэт камсамола трымае цесную сувязь з партыйным бюро, з дэканатам. У такіх творчых кантактах нараджаюцца новыя традыцыі, задумы. Так нарадзілася, напрыклад, ідэя правядзення злётаў студэнтаў-філолагаў на радзіме Я. Купалы. Падрыхтоўка да гэтага свята вядзецца на філфаку на працягу ўсяго года, і па сутнасці злёт становіцца своеасаблівай урачыстай справаздачай аб шматгранным жыцці факультэта.

І ніколі не забудуцца урачыстая лінейка ў Вязынцы, мінута маўчання, гадзіна паэзіі ля купалаўскага помніка, хвалюючыя выступленні ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікоў універсітэта і ганаровых гасцей, трапяткі сцяг злёту, вячэрні касцёр і тая светлая ўзнёсласць, якая ўзвышае, акрыляе чалавека, ачышчае яго ад усяго выпадковага.

Пералічаныя мерапрыемствы ахапілі толькі пазааўдыторныя формы эстэтычнага выхавання студэнтаў. Але нельга не падкрэсліць, што падмуркам, асновай такога выхавання з'яўляюцца, безумоўна, лекцыі, спецсемінары, спецкурсы, практычныя заняткі і іншыя разнастайныя віды вучэбнай работы. Усе яны накіраваны на тое, каб не проста папоўніць веды студэнтаў, але і актыўна фарміраваць усебакова развітую, творчую асобу, якой уласцівы пачуцці патрыятызму, інтэрнацыяналізму, грамадзянская актыўнасць, аптымізм, нястомная прага пазнання і высокай духоўнасці.

**М. ЯФІМАВА,**
**дацэнт, член партбюро філфака.**

# ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК!

ЛЕНІНСКІ СТЫПЕНДЫЯТ

## «МАЁ ЗАХАПЛЕННЕ — ФІЗІКА»

— СКАЖЫЦЕ, дзе я магу знайсці Малярэвіча, студэнта III курса? — запыталася я ў хлопца, што заходзіў у патрэбную мне аўдыторыю.

— Гэта я,— проста адказаў ён, павярнуўшыся да мяне.

Вось так я сустрэлася з ленінскім стыпендыятам, студэнтам фізічнага факультэта Аляксандрам Малярэвічам. Калі Аляксандр паступаў ва універсітэт, па яго словах, ён зусім не збіраўся быць выдатнікам.

— Гэта атрымалася выпадкова. Проста я добра здаў першую сесію, затым другую. Мне, напэўна, пашанцавала,— лічыць Малярэвіч.

Шчаслівая выпадковасць, ці не праўда? Толькі чамусьці не кожны з нас здае ўсе экзамены на выдатна.

У школе, дарэчы, ён таксама вучыўся без чацвёрак. З залатым медалём закончыў дзесяць класаў і адразу паступіў ва універсітэт. Таксама выпадак?

Мяне зацікавіла, чаму Саша выбраў іменна фізічны факультэт універсітэта, а не радыётэхнічны, напрыклад, ці політэхнічны інстытуты.

— Для мяне не існавала пытання, куды пайсці пасля дзесяці класаў. Я вучыўся ў школе з матэматычным ухілам. Вялікая ўвага там удзялялася, зразумела, матэматычным дысцыплінам. Але любімым прадметам для мяне была фізіка.

Спачатку гэта было захапленне самім прадметам у цэлым. А потым прыйшла асаблівая зацікаўленасць да аднаго з раздзелаў фізікі — оптыкі. З ахвотай ён пачынае чытаць спецыяльную літаратуру, знаёміцца з новымі дасягненнямі. Тады і нарадзілася думка атрымаць вышэйшую адукацыю ў гэтай галіне.

Аляксандр Малярэвіч здзяйсняе сваю мару. Калі на III курсе давялося выбіраць спецыялізацыю, ён пайшоў на кафедру спектраскапіі і квантавай электронікі вывучаць лазеры і ўзаемадзеянне лазерных выпраменьванняў з рэчывамі. Выбар кафедры—гэта вызначэнне сваёй далейшай дзейнасці. З захапленнем расказвае мне Аляксандр аб сваёй будучай рабоце:

— Лазеры вабяць мяне іменна тым, што гэта галіна фізікі вельмі маладая, малавядомая і тоіць у сабе вялікія рэзервы навуковых адкрыццяў. Вельмі многа тут недаказаных гіпотэз, нявырашаных праблем.

Курсавая работа Малярэвіча носіць назву «Абарачэнне хвалевага фронту лазерных выпраменьванняў». Гэта тэма стане і тэмай яго дыпломнай работы. Над ёй ён працуе ў лабараторыі, на кафедры, дома, у вольны час ад асноўных заняткаў.

Але не трэба думаць, што толькі праблемы фізікі цікавяць і хвалююць Аляксандра (калі шчыра, то такая думка спачатку склалася ў мяне самой). Вольны час — гэта і мастацкая літаратура, і тэатр, і кіно.

— Наогул, меркаванне аб студэнтах тэхнічных факультэтаў, што яны быццам не цікавяцца мастацтвам,— поўнасцю памылковае. Я не ведаю сярод сваіх аднакурснікаў людзей, што былі б абыякавыя да цікавай кнігі, цудоўнай музыкі, —удакладняе Саша.

**С. ВЯРОХА,**
**студэнтка журфака.**

ІНТЭРВ'Ю

## ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ

«Злавіць» трэцякурсніка філфака А. Малахава ў інтэрнаце — задача няпростая. Увесь яго час плануецца па хвілінах. І ўсё ж ён адклаў свае справы, каб падзяліцца вопытам.

**— Раскажы, калі ласка, пра свой метад вучобы, з дапамогай якога ты на працягу трох гадоў застаешся выдатнікам!**

— Галоўнае, не запускаць матэрыял, не адкладваць яго засваенне на потым. Праслухаўшы лекцыю, імкнуся адразу замацаваць атрыманыя веды — прачытаць праграмны твор, калі гэта літаратура, папрацаваць над тэмай самастойна.

**— Звычайна пачаткоўцы з нейкім нават страхам чакаюць сваю першую сесію. Якія пачуцці перажываў ты ў гэты час?**

— Калі займацца на працягу года, то экзамены не здадуцца непераадольнымі. Таму што амаль усе пытанні ўжо вывучаны. Застаецца толькі іх паўтарыць і сістэматызаваць. Дзень, зразумела, ушчыльняецца, але рэжым я ніколі не парушаю. 2—3 гадзіны адводжу на кансультацыі аднакурснікам. Даўно ўжо даказана: калі тлумачыш іншым, лепш разумееш сам.

**— Як ты сумяшчаеш грамадскую работу з вучобай?**

— Я — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па інтэрнацыянальнаму выхаванню, член спортбюро, з другога курса займаюся ў СНТ. На маю думку, без грамадскай нагрузкі студэнт — не студэнт. А што датычыцца недахопу часу... Каб паспець усюды, трэба стаць вельмі сабраным і мэтанакіраваным.

**— Калі ведаеш, як многа ты паспяваеш зрабіць, паўстае заканамернае пытанне: ці застаецца ў цябе час на адпачынак!**

— Зразумела. Кіно, тэатры— гэта абавязкова, хаця і не вельмі часта. Яшчэ захапляюся футболам, шахматамі, шмат самастойна займаюся англійскай мовай.

**— Апошняе пытанне — традыцыйнае: што б ты пажадаў першакурснікам!**

— Паўтару: дакладна выконваць указанні выкладчыка, сур'ёзна весці канспект, старацца не прапускаць заняткі. Выкананне гэтых простых умоў — гарантыя поспеху.

**Запісала В. ЖУРАК,**
**студэнтка філфака,**
**слухачка аддзялення**
**журналістыкі ФГП.**

## СЛОВА ЗА НАМІ

**ХУТКА ЛЯЦІЦЬ ЧАС. ВОСЬ І ЗАРАЗ, ЯК КОЖНЫ ГОД, ЗАКАНЧВАЮЦЦА СЕМІНАРЫ, ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ. І ПРЫЙДЗЕ СЕСІЯ... ГЭТА АДНА З АСАБЛІВАСЦЕЙ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ, ГЭТА ВЫПРАБАВАННЕ, ЯКОЕ КОЖНАМУ ХОЧАЦЦА ВЫТРЫМАЦЬ ДОБРА, ГЭТА, НАРЭШЦЕ, РАСКРЫЦЦЁ ЛЕПШЫХ ЯКАСЦЕЙ КОЖНАГА СТУДЭНТА.**

**ВОСЬ ШТО РАСКАЗАЎ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМОВЫХ ЭКЗАМЕНАЎ НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ НАМЕСНІК ДЭКАНА ПЁТР АЛЯКСЕЕВІЧ ШУЛЯК:**

— Сесія пачынаецца нябачна для нас у пачатку навучальнага года. Як студэнт рыхтуецца да сесіі на працягу семестра, так ён і вытрымае яе. Толькі тады зможаш атрымаць грунтоўную адукацыю, калі будзеш займацца не час ад часу, а кожны дзень, рыхтавацца да кожнай лекцыі, кожнага семінара. Я заўсёды паўтараю студэнтам, што галоўнае—вучыць усё пастунова, а не штурмам.

Што канкрэтна робіцца для таго, каб студэнты добра здалі сесію? На апошнім сваім пасяджэнні савет факультэта разглядаў становішча спраў на кожным курсе. Праводзіліся гутаркі са студэнтамі, якія маюць акадэмічныя запазычанасці, выяўлены прычыны нездавальняючай вучобы гэтых студэнтаў, ім аказана дапамога. Усе азнаёмлены з палажэннем аб здачы экзаменаў і залікаў, абароне курсавых работ.

Распрацаваны расклад залікаў і экзаменаў, у якім улічаны ўсе пажаданні студэнтаў. Застаецца слова за студэнтамі. Усё, што патрабуецца ад дэканата, зроблена...

Ну што ж, слова за намі. Няхай жа яшчэ раз усміхнецца нам лёс у выглядзе шчаслівых білетаў і выдатных адзнак.

**Ж. ЖМАЙЛІК.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

НАПЯРЭДАДНІ СЕСІІ

## АДКАЗНАЯ ПАЗІЦЫЯ

ЗДАЕЦЦА, яшчэ ўчора мы працавалі на калгасных палетках Клімавіцкага раёна, а сёння ўжо закапочаны падрыхтоўкай да першай студэнцкай сесіі. Толькі той, хто плённа працуе, самастойна авалодвае неабходнымі ведамі, зможа паспяхова да экзаменаў з цвёрдай надзеяй атрымаць выдатныя адзнакі.

Да ліку студэнтаў журфака, якія з першых дзён па-сур'ёзнаму ўзяліся за вучобу, можна аднесці Ігара Зыбайлу і Валянціна Жданко. Яны рэгулярна наведваюць лекцыі, уважліва сочаць за выкладаннем новага матэрыялу, старанна канспектуюць яго. Колькі разоў прыходзілася бачыць сур'ёзны, удумлівы выраз твару Ігара, калі ён самастойна працуе з падручнікамі, шукае адказ на нявырашанае пытанне. У любы час ён рад падзяліцца з кожным якой-небудзь думкай па прадмету, гатоў даць пэўную параду. Ігар знаходзіць час і каб наведваць школу маладога лектара. Добра пасябраваў студэнт і з «Чырвонай зменай», на старонках якой друкуе свае заметкі.

Ігар і Валянцін — удзельнікі журфакаўскага хору і некалькі разоў у тыдзень бываюць на яго рэпетыцыях. У іх, як ва ўсіх маіх аднакурснікаў, пазіцыя напярэдадні сесіі — адказная.

**С. МАЕЎСКІ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома).**

САВЕТ ВЫДАТНІКАЎ

## РАСКРЫЦЬ МАГЧЫМАСЦІ

ГАЛОЎНАЕ прызначэнне савета выдатнікаў, які існуе пры камітэце камсамола БДУ імя У. І. Леніна, — прапагандаваць вучобу лепшых студэнтаў, аказваць кансультацыйную і практычную дапамогу першакурснікам.

Нядаўна выбраны састаў савета толькі пачаў работу. Святлана Канаш, студэнтка II курса хімфака, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па вучэбнай рабоце, член бюро ЦК ЛКСМБ расказвае аб тым, што новага будзе сёлета ў дзейнасці савета выдатнікаў:

**— Ад таго, наколькі ўдала першакурснік справіцца з першай сесіяй, залежыць і далейшая яго вучоба. Для выдатнікаў у гэтым напрамку вялікае поле дзейнасці. І ў першую чаргу — гэта практычная дапамога першакурснікам у арганізацыі самастойнай работы ў час экзаменаў і залікаў.**

**У плане прапагандысцкай і прафарыентацыйнай дзейнасці савета мы мяркуем рэгулярна выступаць перад слухачамі падрыхтоўчага аддзялення, вучнямі выпускных класаў школ. У час канікулаў студэнты раскажуць аб універсітэце ў школах па месцу жыхарства.**

**У другім семестры правядзём грамадскі агляд ведаў першакурснікаў у якасці эксперыменту на адным факультэце і ў адной групе. У дэталях ход яго пакуль што не поўнасцю распрацаваны, але асноўная мэта акрэслена: удасканальванне самастойнай работы з падручнікамі і дадатковай літаратурай.**

**І. ПАПКО,**
наш кар.



Чацвёртакурсніца хімфака Таццяна Мароз не толькі паспяхова вучыцца, але і вядзе вялікую грамадскую работу, з'яўляючыся членам камітэта камсамола факультэта. Фота В. ШАЧАКА.

З АСАБІСТАГА ВОПЫТУ

## Каб адчуць адказнасць

АПОШНІЯ ТЫДНІ вучобы, апошнія лекцыі, семінары, за імі — сесія. Для кагосьці яна першая ў жыцці, для кагосьці ўжо звыклая справа (зрэшты, ці можа сесія стаць звыклай?).

Але ўсіх нас, студэнтаў, незалежна ад таго, на якім курсе мы вучымся, аб'ядноўвае зараз адно жаданне: здаць сесію як мага лепш, пацвердзіць добрыя адзнакамі веды, атрыманыя на працягу навучальнага семестра. Тым больш, што гэта сесія незвычайная: яна супадзе са святкаваннем юбілею нашага універсітэта. Кожнаму студэнту хочацца адзначыць слаўнае 60-годдзе БДУ імя У. І. Леніна найлепшымі вынікамі.

Асабліва хвалююцца першакурснікі, бо не вельмі проста пераключыцца са школьнай сістэмы навучання на вузаўскую. Таму, зразумела, яны звяртаюцца ў першую чаргу да вопыту старэйшых. Можа і мае парады дапамогуць каму-небудзь сустрэць экзамены з большай упэўненасцю.

Я перакананы, што спасцігнуць ва ўсім аб'ёме прадмет немагчыма за 3—4 перадэкзаменацыйныя дні. А на практычных занятках, семінарах паглыбляецца, абагульняецца матэрыял па вядучых тэмах. Таму важна добра рыхтавацца да іх.

Акрамя абавязковых падручнікаў, чытайце як мага больш дадатковай літаратуры, паглыбляйце свае веды. А калі нешта незразумела, не бойцеся звяртацца за дапамогай да выкладчыкаў, старэйшых студэнтаў, да сваіх аднакурснікаў.

Калектыўная работа па падрыхтоўцы да семінараў больш эфектыўная, чым вучоба па-асобку. Асабліва гэта датычыцца нашай спецыяльнасці — геаграфіі, дзе значнае месца адводзіцца рабоце з картай. Толькі разам з таварышамі, правяраючы і дапамагаючы адзін аднаму, можна добра падрыхтавацца да заняткаў, залікаў.

Чытальныя залы і кабінеты кафедр у апошнія дні семестра становяцца другім домам студэнта. Там заўсёды можна знайсці патрэбную літаратуру. Акрамя таго, атмасфера чытальных залаў і кабінетаў дысцыплінуе, садзейнічае больш паглыбленай працы.

Важна ў любой тэме або раздзеле ўмець вызначаць галоўнае, супастаўляць яго з ужо вядомым матэрыялам, умець абгрунтаваць сваю думку.

Надыходзячая сесія патрабуе вялікай увагі, аднак нельга ў гэты час перапыняць грамадскую работу. Нельга забываць і аб спорце. Ён паляпшае настрой і самаадчуванне, дапамагае правільна размеркаваць працоўны час і адпачынак.

Прадуманае планаванне працоўнага дня, спалучэнне разумовых нагрузак з фізічнымі дапамагае паспяхова здаць сесію.

**А. КАЎХУТА,**
**студэнт IV курса геафака,**
**ленінскі стыпендыят.**

ТАБЕ, ПЕРШАКУРСНІК!

● КАЛЕКТЫЎ: ПРАБЛЕМЫ СТАНАЎЛЕННЯ

# КРОКІ ДА ВЫШЫНІ

**СЕМАЯ ГРУПА ДРУГОГА КУРСА МЕХМАТА ЛІЧЫЦЦА ЛЕПШАЙ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ.**

## КРОК ПЕРШЫ: «ПАЗНАЁМІЛІСЯ»

Першага верасня 1980 года ўся група сабралася каля дзвярэй 438 (усе дагэтуль памятаюць гэтыя тры лічбы) аўдыторыі. У той дзень ім уручалі студэнцкія білеты, залікоўкі, знаёмілі з куратарамі. А пакуль дзяўчаты прыглядаліся адна да адной, нясмела загаворвалі аб літаратуры, кіно... Хлопцы ж ад нечага рабіць разглядалі спартыўныя стэнды. Размова, шчыра кажучы, не клеілася. Тут падышоў — успамінаюць мае субяседнікі Люда Савельева, Сярожа Каржаневіч — Валодзя Анацка.

— Давайце знаёміцца, — прапанаваў проста хлопец.

Усе нібы чакалі гэтага штуршка, адразу ж загаманілі. Размова, безумоўна, атрымалася добрай і шчырай. Сярод усіх вызначаўся Валодзя.

— Штосьці ёсць у яго ў характары, што прываблівае, цягне да сябе іншых, — сказаў староста групы Аляксандр Анацьеў. Адразу ж, на «бульбе», мы ўбачылі яго арганізатарскія здольнасці. Хоць Валодзя і кажа, што выбралі яго камсоргам групы выпадкова, мы думаем інакш. Хлопец заўсёды неяк добра вызначаўся сярод усіх рабят. Нездарма ў гэтым годзе Анацку выбралі ў камітэт камсамола. Ён многа зрабіў для групы. У тым, што мы два разы выходзілі пераможцамі ў сацыялістычным спаборніцтве, ёсць і Валодзева заслуга. Ён заўсёды мог адстаяць інтарэсы сваёй групы.

## КРОК ДРУГІ: «ВОСЬ І СТАЛІ МЫ СТУДЭНТАМІ»

У пасведчанні першакурсніка ММФ чытаем: «З гэтага дня, 24 красавіка 1981 года, ты залічваешся ў вялікую сям'ю мехмацян. Будзь дастойны аказанага табе гонару!».

На факультэце існуе традыцыя: сапраўдным студэнтам ты станеш тады, калі паспяхова пройдзеш першую сесію. Тады ты ўжо «паўнацэнны мехматавец».

Восем месяцаў да гэтага ўрачыстага дня пройдзена разам. Сапраўды, час немалы, і спраў таксама шмат зроблена. «Агеньчык» для дзяўчат на 8 Сакавіка, дзень імянінніка, удзел у будаўніцтве «Гаудэамуса» — такое не забываецца...

## КРОК ТРЭЦІ: «НА ПАРАДКУ ДНЯ — КАМСАМОЛЬСКАЯ АТЭСТАЦЫЯ»

Як адна з лепшых груп на ММФ, сёмая, атрымала права праводзіць камсамольскую атэстацыю самастойна, без ніякіх камісій. Праходзіў эксперымент. Усе камсамольцы выказвалі сваю думку, задавалі прынцыповыя пытанні. Тут ужо кожны быў навідавоку. Для сябе ўсім студэнтам выстаўлялі адзнакі. Кожны ведаў, што хаця ў ведамасці стаіць «залік», але паміж пяцёркай і тройкай — вялікая розніца. На другі год, калі зноў будзе тройка, дык яна выльецца ў «незалік». Тут нікому не было ніякай скідкі. Вядома, не абышлося без спрэчак. Але калі ты не выконваеш грамадскія абавязкі, прапускаеш заняткі, то, будзь добры,—адказвай.

## КРОК ЧАЦВЁРТЫ: «МАЯ РАДЗІМА — СССР»

Група атрымала сорак рублёў прэміі за перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве. «Куды іх падзець?» — адразу ж паўстала пытанне. Пасля доўгіх размоў вырашылі ўключыцца ў экспедыцыю «Мая Радзіма —СССР». Група ўжо наведала шмат памятных месц.

— Адразу лічылі ўсё гэта фармальнасцю, — расказвае новы камсорг Ян Іадкоўскі. — Але пераканаліся, што мы глыбока памыляліся. Колькі цікавага, нязведанага раней мы пазналі і ўбачылі! Наперадзе больш чым тры з паловай гады вучобы. Думаем, што ў будучым мы наведаем самыя далёкія куткі нашай краіны. Бліжэйшая наша мэта — паехаць у Рыгу. У паездках мацнее наша сяброўства. І больш пазнаеш сваіх аднакурснікаў. У экскурсійных клопатах праяўляюцца лепшыя рысы нашых рабят.

Колькі яшчэ крокаў трэба будзе зрабіць мехматаўцам, пакуль апошні раз пракрочаць яны па прыступках нашага універсітэта. А наперадзе яшчэ амаль усё жыццё. І як пойдуць яны па ім, залежыць толькі ад іх саміх.

Р. МАРЧУК.
(Прэс-цэнтр прафкома).

# СУСТРЭЧА З ПЕСНЯЙ

**У МІНСКУ АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ УСЕСАЮЗНАЙ КАМІСІІ ВАЕННА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ МУЗЫКІ САЮЗА КАМПАЗІТАРАЎ СССР. ЯГО УДЗЕЛЬНІКІ ПАБЫВАЛІ Ў ГАСЦЯХ У СТУДЭНТАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

Мы з нецярплівасцю чакалі тых, чые песні заўсёды былі блізкімі і дарагімі. Па добраму звычаю сустрэлі традыцыйным хлебам-соллю. З уступным словам выступіў заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, старшыня Усесаюзнай камісіі ваенна-патрыятычнай музыкі кампазітар Барыс Сямёнавіч Цярэнцьеў.

Пленум праходзіў у дні 40-й гадавіны разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў у бітве пад Масквой. І вельмі сімвалічна, што ён адбыўся на беларускай зямлі, дзе ўсё — і самотныя званы Хатыні, і помнікі над брацкімі магіламі — нагадвае аб бессмяротным подзвігу савецкага народа...

У выкананні заслужанага артыста РСФСР А. Падгайскага, салістаў Масканцэрта А. Шаўчэнкі, І. Іванова прагучалі песні кампазітараў В. Войціка, Б. Фігоціна, Б. Цярэнцьева: «Юнацтва камсамольскае», «Першае каханне», «Салдаты мінулай вайны» і іншыя.

Дружнымі апладысментамі сустрэлі студэнты беларускага кампазітара, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Э. Ханка. Яго новая песня «Белы бусел» усхвалявала і адразу прыйшлася па душы.

— Мяне заўсёды здзіўляла здольнасць людзей пісаць музыку,— гаварыла ў перапынку студэнтка філалагічнага факультэта Ж. Палюховіч, — і таму сустрэчы з кампазітарамі для мяне — свята, свята прыгажосці і таленту.

Для кожнага з нас падобныя мерапрыемствы — яшчэ і выдатная магчымасць павышэння культурнага ўзроўню.

І. ПАПУРЭНКА,
студэнтка філфака.



У зімовым парку.
Фотаэцюд В. Шачака.

● МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## *Сяброў стала больш*

**ШМАТ ЗАМЕЖНЫХ** студэнтаў навучаецца на факультэце журналістыкі. Тут ёсць прадстаўнікі Лацінскай Амерыкі, Афрыкі, Азіі, Блізкага і Сярэдняга Усходу.

Нядаўна перад першакурснікамі факультэта выступіў студэнт IV курса Лі Амаду, які прыехаў да нас з Народнай Рэспублікі Гвінеі, з краіны, якая 60 гадоў знаходзілася пад уладай Францыі. Толькі ў 1958 годзе Гвінея атрымала незалежнасць. А 1960 год — яшчэ адна важная веха ў гісторыі маладой краіны: яна выбірае некапіталістычны шлях развіцця, якога трымаецца і зараз.

Крыху больш за паўсотні чалавек з вышэйшай адукацыяй налічвалася ў краіне да атрымання ёю незалежнасці, а зараз іх каля 15 тысяч. Хутка атрымаюць абраную спецыяльнасць і наш новы знаёмы і яго сябры, а іх, студэнтаў з Гвінеі, зараз у СССР каля 900 чалавек. Дарэчы, брат Лі таксама атрымаў у нас вышэйшую адукацыю —ён скончыў політэхнічны інстытут.

Лі падрабязна расказаў аб тым, што дала гвінейцам рэвалюцыя. Моладзь можа бясплатна вучыцца ў любой навучальнай установе, кожны чалавек мае права на медыцынскае абслугоўванне...

Слухаць нашага госця было вельмі цікава. Нягледзячы на тое, што гаварыў ён на не зусім правільнай рускай мове, мы яго разумелі. Лі Амаду ехаў да нас не толькі з мэтай набыць спецыяльнасць журналіста. Ён імкнецца пазнаць лепш нашу краіну, савецкіх людзей, знайсці тут сабе сяброў. Можна лічыць, што іх пасля гэтай сустрэчы стала ў Лі яшчэ больш.

В. СВЯТЛАНАВА.

# РАЗМЕРКАВАНЫ АБАВЯЗКІ

**Адбыўся арганізацыйны пленум камітэта камсамола універсітэта, на якім размеркаваны абавязкі:**

### БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

**Т. Арцюх, Л. Валчок, В. Гуліс, Л. Гайдукевіч, А. Казулін, А. Клокаў, С. Канаш, А. Нежавец, А. Новік, А. Нікіценка, А. Рухля, Т. Сотчанка, В. Савічаў, А. Чулкоў, М. Януцёнак.**

### АРГАНІЗАЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

**Л. Гайдукевіч** — намеснік сакратара камітэта камсамола па арганізацыйнай рабоце;

**Л. Валчок** — загадчыца сектара ўліку;

**В. Гуліс** — кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола, студэнтка III курса журфака;

**А. Казулін** — старшыня персанальнай камісіі, стажор-выкладчык механіка-матэматычнага факультэта;

**В. Савічаў** — адказны за школу камсамольскага актыву, студэнт IV курса юрфака;

**А. Шыбут** — старшыня штаба «КП», асістэнт кафедры лічбавых метадаў і праграміравання мехмата;

**М. Януцёнак** — адказны за сектар сацыялістычнага спаборніцтва, інфармацыі і кантролю, студэнт II курса гістфака.

### ІДЭАЛАГІЧНЫ АДДЗЕЛ

**А. Нежавец** — намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце.

**П. Аксючыц**—адказны за работу з кафедрамі грамадскіх навук, стажор-выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі гістфака;

**Л. Бараноўская** — загадчыца сектара маральна-этычнага выхавання, інструктар студэнцкага клуба;

**Д. Буката** — адказны за гераіка-патрыятычны сектар, студэнт III курса радыёфізічнага факультэта;

**А. Вялікаселец** — загадчык спартыўнага сектара, студэнт II курса геафака;

**П. Вянглінскі** — камандзір АКАД, студэнт III курса юрфака;

**У. Гафановіч** — адказны за групу «Доўг», студэнт III курса радыёфізічнага факультэта;

**А. Гулевіч** — адказны за палітасветніцкае выхаванне, студэнт V курса гістфака;

**В. Гусько** — адказная за сектар па рабоце з вячэрнім аддзяленнем, метадыст ФГП;

**А. Кішкевіч** — адказная за сектар Ленінскага заліку і ГПП, бібліятэкар-метадыст;

**В. Кураш** — загадчык студэнцкай сацыялагічнай лабараторыі, студэнт IV курса гістфака;

**В. Паплаўскі** — адказны за работу ў інтэрнатах, студэнт III курса юрфака;

**У. Пузікаў** — дэкан ФГП, выкладчык кафедры палітэканоміі;

**В. Шландыкаў** — адказны за прававое выхаванне, студэнт IV курса юрфака;

**Т. Арцюх** — намеснік сакратара камітэта камсамола па рабоце з дзецьмі і падлеткамі, студэнтка III курса філфака;

**В. Малафееў** — адказны за педатрады, студэнт V курса радыёфізічнага факультэта;

**А. Спадабаева** — адказная за работу па месцу жыхарства, студэнтка III курса ФПМ.

### ВУЧЭБНА - НАВУКОВЫ АДДЗЕЛ

**С. Канаш** — намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай рабоце, студэнтка II курса хімфака;

**А. Нікіценка** — намеснік сакратара камітэта камсамола па навуковай рабоце, кіраўнік СКБ;

**С. Голад** — адказная за работу з выдатнікамі, студэнтка IV курса біяфака;

**С. Мельнічук** — адказны за сектар новага прыёму, студэнт III курса фізфака;

**С. Амельянец** — адказная за работу савета выдатнікаў, студэнтка IV курса ФПМ;

**І. Сабачэўская** — старшыня ВВК, студэнтка III курса філфака;

**А. Патрын** — старшыня СМВ і С, дацэнт фізфака;

**А. Шыдлоўскі** — адказны за сувязь з вытворчасцю і АН БССР, старшы інжынер, сакратар камсамольскай арганізацыі НДІ ПФП;

**А. Рубанаў** — старшыня навуковага студэнцкага савета, стажор-выкладчык кафедры гісторыі КПСС.

### АДДЗЕЛ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ

**А. Новік** — намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнаму выхаванню;

**В. Шадурскі** — адказны за работу з зямляцтвамі, студэнт III курса гістфака;

**Т. Ляўданская** — прэзідэнт савета Дружбы, студэнтка IV курса мехмата;

**А. Вашкевіч** — адказны за сектар інтэрнацыянальнага выхавання савецкіх студэнтаў, студэнт IV курса юрфака.

### ШТАБ ПРАЦОЎНЫХ СПРАЎ

**А. Чулкоў** — намеснік сакратара камітэта камсамола па працоўнаму выхаванню;

**П. Іваноў** — камісар ШПС, студэнт IV курса гістфака;

**А. Астапенка** — інжынер ШПС, студэнт III курса юрфака;

**Г. Максімаў** — намеснік начальніка ШПС, студэнт III курса юрфака.

### САКРАТАРЫ КАМІТЭТАЎ КАМСАМОЛА ФАКУЛЬТЭТАЎ

Біяфак — **А. Гур'еў**
Геафак — **Л. Лысянок**
Журфак — **У. Нікалайчук**
Гістфак — **П. Аксючыц**
Мехмат — **В. Жук**
ФПМ — **А. Сатолін**
Фізфак — **А. Каранько**
Філфак — **Т. Сотчанка**
Хімфак — **Д. Мычко**
Юрфак — **А. Войцік**
Радыёфізікі і электронікі — **І. Андрушкевіч**
Камітэт камсамола супрацоўнікаў — **А. Клокаў**.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

17 снежня 1981 г.

Заказ 2016 АТ 04536

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ